PolotskSU



УДК 930.26 (476)

# ПРАБЛЕМЫ АПІСАННЯ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫІ АРХЕАЛАГІЧНАГА МАТЭРЫЯЛУ СА СКУРЫ З ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

*І.С. КАМІНСКІ*
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт

*Зроблена спроба вызначэння праблем апісання і сістэматызацыі археалагічнага матэрыялу са скуры з тэрыторыі Беларусі. Адносна рэдка скураныя прадметы, атрыманыя падчас археалагічных раскопак, аналізуюцца комплексна з улікам адыходаў вытворчасці і функцыянальна нявызначаных вырабаў. Звычайна прадстаўляюцца найбольш захаваныя і ўнікальныя рэчы з асобных раскопак. Вылучаюцца наступныя праблемы: своечасовасць апісання, структураванне апісання і сістэматызацыя археалагічнага матэрыялу са скуры ў адпаведнасці з сучаснымі схемамі, інфарматыўнасць апісання знаходак. Прапанаваны шляхі іх вырашэння.*

*Ключавыя словы:Беларусь, скура, археалагічныя знаходкі, апісанне і сістэматызацыя.*

Уводзіны. Павелічэнне колькасці археалагічных калекцый скуры у выніку раскопак еўрапейскіх гарадоў з другой паловы XX ст. выклікала неабходнасць распрацоўкі методыкі іх апісання, сістэматызацыі і вывучэння з мэтай рэалізацыі інфармацыйнага патэнцыяла знаходак [1–4]. Было зроблена шэраг спроб прыняцця адзінага варыянту прадстаўлення археалагічных матэрыялу са скуры [4–9].

У межах артыкула мэтазгодна спыніцца на асноўных навуковых працах, якія вызначаюць сучасныя мадэлі прадстаўлення археалагічнага матэрыялу са скуры. На аснове аналіза асноўных айчынных археалагічных прац зроблена спроба акрэсліць праблемы апісання і сістэматызацыі археалагічных знаходак са скуры з гарадоў Беларусі і вызначыць шляхі іх вырашэння.

Асноўная частка. Гістарыяграфічны аспект апісання і сістэматызацыі археалагічнага матэрыялу са скуры пры яго вывучэння закраецца ў працах А.В. Курбатава, Д.А. Осіпава, А. Пушкорыўса, А. Кавальскай і інш. [1, с. 25-27; 2, с. 11-15, 33-39; 3, с. 57-61; 7, s. 198-210; 9, s. 230-235]. Паводле А. Пушкорыўса ў Еўропе існуе дзве гістарыяграфічныя традыцыі прадстаўлення археалагічнага абутку: усходнееўрапейская (А.І. Аяцева), заходнееўрапейская (О. Губітц). Да апошняй адносяцца таксама скандынаўскія даследаванні. Даследчык аддае перавагу заходнееўрапейская метадалогіі як больш зручнай для працы і інфарматыўнай [9, s. 230-235]. Адпаведным чынам А. Кавальска характарызуе польскую, расійскую і заходнееўрапейскую гістарыяграфіі па археалагічнаму вывучэнню рамёстваў звязаных з апрацоўкай скуры [7]. А.В. Курбатавым былі вылучаны тры падыходы апісання і вывучэння скураных прадметаў з археалагічных раскопак: канкрэтна-гістарычны, фармальна-аналітычны і гісторыка-этнаграфічны [1, с. 26].

PolotskSU



Канкрэтна-гістарычны падыход дазваляе разглядзець формы і канструкцыі вырабаў у асобныя гістарычныя перыяды, адпаведна, для гэтага падыхода характэрна этапнасць развіцця канструкцый вырабаў. Прыкладам выкарыстання адзначанага падыходу з'яўляецца тыпалогія абутку распрацаваная А.І. Аяцевай – «мяккі» і «цвёрды» абутак суцэльнакроенай і дэталёвакроенай формаў [1, с. 26; 10, с. 107].

Сутнасць фармальна-аналітычнага падыхода заключаецца ў сістэмным апісанні рэчаў па прыкметах і комплексам прыкмет [1, с. 26]. Паводле схемы Д.А. Осіпава знаходкі апісваюцца тэрмінамі, характарызуючымі асобныя прыкметы, якія могуць быць выкарыстаны для ўсіх відаў вырабаў. Асновай для фармалізаванага апісання скуранога абутку, прапанаванага Д.А. Осіпавым, сталі прынцыпы сістэмнага падыхода, распрацаваныя на семінары «Морфология древностей» на кафедры археалогіі МДУ пад кіраўніцтвам Ю.Л. Шчапавай. Вылучаны такія блокі як марфалогія, тэхніка вытворчасці, матэрыял і функцыя. У межах «марфалогіі» вылучаюцца свае падсістэмы: канструкцыя і форма, колер, памер і дэкор [4, с. 23-24]. Падобныя спробы стандартызаваць апісанне археалагічнага матэрыялу са скуры былі зроблены ў 1980 М. Мілеўскай [8] і ў 1984 г. О. Губітцам [6].

Асаблівасцю гісторыка-этнаграфічны падыходу з'яўляецца комплекснае вывучэнне крыніц не толькі як матэрыяльнай з'явы ў сферы вытворчасці і спажывання, але і звязаных з імі форм чалавечай дзейнасці, арыентацыі і вопыту [1, с. 26].

Сучаснаму стану апісання і сістэматызацыі археалагічнага матэрыялу са скуры з гарадоў Беларусі ўласцівы шэраг праблем. Вызначаны наступныя праблемы і шляхі іх вырашэння. Па-першае, гэта своечасовае апісанне «археалагічнай скуры». Часткова адзначанае пытанне вырашаецца падчас правільнай палявой фіксацыі і кансервацыі, што дазваляе захаваць (ці па меншай меры затрымаць разбурэнне) памеры дэталей, колер, сляды зносу і эксплуатацыі, злучэння дэталей і, адпаведна, якасна іх зафіксаваць [4, с. 114; 11; 12, s. 244-263]. У адваротным выпадку ўзнікаюць цяжкасці з прычыны ўсыхання, расслаення і плеснявення пры знаходжанні матэрыялу без спецыяльных умоў захавання. Своечасовае апісанне набывае асаблівую актуальнасць пры немагчымасці інфарматыўна апісаць у першапачатковы перыяд пасля знаходжання калекцыі, што можа быць выклікана адсутнасцю ў даследчыка ведання тэхніка-канструкцыйных асаблівасцей вырабаў і тэрміналогіі гарбарна-шавецкай вытворчасці. Адпаведна ўзнікаюць цяжкасці падчас апісання, сістэматызацыі і графічнай фіксацыі тэхніка-канструкцыйных, дэкаратыўных характарыстык і асаблівасцяў знаходак з скуры. Вырашэнне адзначанай праблемы было прапанава Д.А. Осіпавым шляхам вышэйадзначанай фармалізацыі апісання. Д.А. Осіпавым прыведзены алгарытм апісання знаходак скуранога абутка з выкарыстаннем тэрміналагічнага слоўніка, справачніка-класіфікатара і камп'ютэрных баз дадзеных, што дазваляе захаваць значную частку інфармацыі археолагам, які праводзіць раскопкі, без прыцягнення абуўшчыкоў-тэхнолагаў [13].

Другім пытаннем, якое патрабуе вырашэнне, з'яўляецца структураванне апісання і сістэматызацыя археалагічнага матэрыялу са скуры з гарадоў Беларусі ў адпаведнасці з сучаснымі схемамі. У межах адзначанага істотнае месца займае тэрміналогія і прыкметы апісання, сістэматызацыі і вывучэння знаходак. Нестандартызаванасць

PolotskSU



апісання, паралельнае выкарыстання розных схем апісання знаходак, існавання тэрміналогіі, якая замацавалася ў гістарыяграфіі і сучаснай тэрміналогіі гарбарскай і шавецкай вытворчасці прасочваецца на польскай, літоўскай і, у меньшай ступені, на расійскай гістарыяграфіях. Пры аглядзе літоўскіх прац А. Пушкорыусам адзначана выкарыстанне як усходнееўрапейскай так і заходнееўрапейскай метадалогіі вывучэння «археалагічнай скуры» [9]. Спробай устанаўлення адпаведнасці паміж асноўнымі тэрмінамі, якія зязаныя з гарбарна-шавецкай прадукцыяй і выкарыстоўваюцца ў заходнееўрапейскай, расійскай і польскай археалагічнай літаратуры з’яўляецца праца А. Кавальскай «Archeologia o średniowiecznym skórnictwie na ziemiach polskich. Zarys problematyki» [7].

У беларускай гістарыяграфіі, з прычыны нерэгулярнага знаходжання і, адпаведна, вывучэння вырабаў з скуры, адсутнасці сучасных манаграфічных даследаванняў, апісанне і сістэматызацыя «археалагічнай скуры» не атрымала шырокай распрацоўкі. Методыка прадстаўлення археалагічнага матэрыялу са скуры з гарадоў Беларусі стваралася ў рэчышчы савецкай гістарыграфіі і адпавядала ўсходнееўрапейскай гістарыяграфічнай традыцыі. Працы С.А. Ізюмавай [14; 15], А.І. Аяцевай [16; 17; 18], Ю.П. Зыбіна [19] з’яўляліся адзінкавымі ў 1950-80-я гг. па вывучэнні археалагічнага матэрыялу са скуры з гарадоў Расіі і сталі ўзорам для апісання і аналіза тэхналогіі і прадукцыі гарбарна-шавецкага рамяства ў гарадах Беларусі сярэднявечнага перыяду. У цэлым працы беларускіх археолагаў характарызуюцца агульным прыкладам для апісання і сістэматызацыі і, адпаведна, адзіным варыянтам тыпалагічнага прадстаўлення археалагічнага матэрыялу са скуры, у тым ліку і іх вызначэнняў. Адзначае прасочваецца на створаных асноўных класіфікацыях скураных вырабаў.

Першая мэтанакіраваная класіфікацыя на археалагічным матэрыяле са скуры з беларускіх гарадоў з’явілася ў працы Г.В. Штыхава, прысвечанай шавецкаму рамяству Полацка старажытнарускага перыяду, дзе былі вызначаны такія вырабы як скураны абутак, рукавіцы, похвы, дэталі мячоў і кашалькі [20, с. 87-88]. Асноўная ўвага была нададзена абутку, крытэрыем падзелу якога на тыпы (поршні, чаравікі, туфлі, паўбоцікі, боты) была абрана канструкцыя нарыхтоўкі. Адрозненне прапанаванага падзелу скуранога абутку ад прынятых С.А. Ізюмавай мела тэрміналагічны характар. Так, Г.В. Штыхаў называе чаравікамі абутак, які С.А. Ізюмава па наўгародскім матэрыяле вызначае як «мяккія туфлі» [14, с. 202]. Адпаведным чынам К.П. Шут пры публікацыі археалагічных знаходак мінскага абутку вылучае поршні, башмакі, туфлі, паўботы і боты. Розніца паміж туфлямі і башмакамі (чаравікамі), паводле класіфікацый Г.В. Штыхава і К.П. Шута, заключаецца ва ўзроўні пакрыцця ступні (туфлі даходзяць да шчыкалаткі з узвышэннем ззаду) [21, с. 75-78].

Наконт тэрміналагічнага вызначэння тыпаў абутку і яго асобных дэталей выклікаюць інтарэс заўвагі прафесійнага абуўшчыка-тэхнолага Ю.П. Зыбіна. У прыватнасці рэцэнзія Зыбіна на артыкул С.А. Ізюмавай апублікаваная ў 1965 г. [19], акрэсліла шэраг нявырашаных і спрэчных пытанняў не толькі наконт тэхналогіі пашыву абутку але і тэрміналагічнага вызначэння яго асобных тыпаў. Вартасць працы з пункту гледжання апісання і сістэматызацыі вырабаў з скуры заключаецца ў вызначэнні праблемы, калі

PolotskSU



тэхналагічная тэрміналогія абуўной вытворчасці не супадае з прынятымі ў археалагічных працах назвамі абутку і яго асобных дэталей. Разыходжанні, вызначаныя Ю.П. Зыбіным, былі наступнымі. Так, адзначана, што туфлямі названы «ботинки» і «полуботинки», а паўбоцікі вызначаюцца як боты з укарочанымі халявамі, у той час як у абуўной вытворчасці гэта асаблівая канструкцыя «ботинок». Наконт дэталей абутку Ю.П. Зыбіным была зроблена заўвага аб адсутнасці ў вывучаемым абутку ўнутранага і знешняга задніка па вызначэнне С.А. Ізюмавай. Гэтыя дэталі ўяўляюць сабой карман і задзінку адпаведна [19, с. 285]. У сваім адказе С.А. Ізюмава на рэцэнзію Ю.П. Зыбіна з прычыны канструкцыйных асаблівасцей вырабаў наўгародскіх шаўцоў настойвае на немагчымасці выкарыстання сучаснай абуўной тэрміналогіі і неабходнасці прыняцця ўведзеных ёй назваў абутку і асобных дэталей [15, с. 286].

З канца 1940-х гг. было створана шэраг спецыяльных археалагічных прац па вырабам са скуры, дзе былі закладзены асновы для іх далейшага вывучэння. Адпаведна з'яўляюцца і праблемныя моманты. Пачынае замацоўвацца ўласная тэрміналогія, у пэўнай ступені адрозная ад прынятай прафесійнымі тэхнолагамі. Апісанне і сістэматызацыя археалагічнага матэрыялу са скуры Г.В. Штыхавым і К.П. Шутом па ўзору публікацый С.А. Ізюмавай, А.І. Аяцевай вызначаецца вылучэннем ідэнтычных катэгорый вырабаў і іх тыпаў. Аднак адсутнасць агульнапрынятай схемы вывучэння вырабаў са скуры ў адзначаны перыяд выклікала з'яўленне тэрміналагічных адрозненняў.

Наступнымі працамі, дзе атрымалі распрацоўку тыпалогія сярэднявечных вырабаў са скуры з гарадоў Беларусі, сталі артыкулы В.М. Ляўко, С.В. Тарасава, Т.С. Бубенькі. Даследавані ўлічвалі схему аналіза скуранога абутку прапанаваная А.І. Аяцевай па выніках апрацоўкі калекцый з Пскова, Старой Ладагі, Белавозера [16; 17; 18].

Уплыў схемы А.І. Аяцевай на апісанне і сістэматызацыю археалагічных знаходак скуранога абутку на працы беларускіх археолагаў 1970-1990-х гг. прасочваецца ў вызначэнні крытэрыяў пры стварэнні класіфікацый, падабенстве графічнага і тэрміналагічнага прадстаўлення вырабаў. Так, у апублікаванай у 1975 г. манаграфіі Г.В. Штыхава «Древний Полоцк» [22] вызначаны два тыпы чаравікоў аналагічныя класіфікацыі скуранога абутку з Старой Ладагі і Белавозера, крытэрыем для падзелу якіх А.І. Аяцевай выкарыстана рознасць крою (1 – з трохвугольным выразам на задніку, 2 – падэшва з закругленная падэшвай і пяткай) [22, с. 77]. Аднатыповыя з пскоўскім, матэрыялам вызначаны вышывальныя швы на полацкім абутку – «назад иглой» і «гусем» [22, с. 78]. У працах В.М. Ляўко таксама крытэрыем падзелу абутку на тыпы выступае характар крою дэталей. Вылучана 4 тыпы ботаў і 5 тыпаў туфель па адрозненнях формы галовак, халяў і заднікаў [23, с. 169-173]. Па схеме А.І. Аяцевай, на аснове працы В.М. Ляўко была дапрацавана класіфікацыя віцебскага абутку Т.С. Бубенькай [24]. Па адзіным узоры вызначаліся метады злучэння дэталей (метад злучэння верха і ніза абутку, назвы швоў).

Апошнімі абагульняючымі працах, дзе археалагічным знаходкам са скуры з гарадоў Беларусі прысвечаны адпаведныя главы з'яўляюцца шматтомнае выданне «Археалогія Беларусі». Так, у выданні «Археалогія Беларусі. Помнікі XIV-XVIII стст.» [25] С.В. Тарасавым асобна не вылучаецца такі тып абутку як туфлі, які прадстаўлены ў класіфікацыі Г.В. Штыхава, В.Н. Ляўко, Т.С. Бубенькі. Даследчыкам прапанавы варыянт

PolotskSU



падзелу нізкага абутку на на тры тыпы [25, с. 360]. Першы тып прадстаўлены мяккімі чаравікамі складанага крою з высокімі борцікамі-клюшавамі на завязках, якія закрывалі шчыкалатку нагі. Другі тып таксама належыць мяккаму абутку, мае нізкія борцікі, на завязках або засцёжках, дзе ўся шчыкалатка адкрытая. Трэці тып мае абцас і вызначаецца як цвёрды абутак. Першыя два тыпы ўласцівы для X-XIII ст., трэці з'яўляецца з XVI ст. [25, с. 360]. Фактычна, другі тып чаравікоў паводле С.В. Тарасава гэта туфлі. Наконт высокага абутку С.В. Тарасавым адзначана праблема вызначэння паўботаў і крытэрый падзелу ботаў на тыпы. У прыватнасці, даследчыкам крытыкуецца падзел ботаў Т.С. Бубенькай на вастраносыя і тупаносыя. Неабходна прыняць меркаванне С.В. Тарасавым, дзе вызначальнай рысай тыпаў ботаў павінна быць канструкцыя абутку (мяккая і цвёрдая) [25, с. 362], што адпавядае класіфікацыі абутку А.І. Аяцевай [10]. Адпаведным чынам варта падзяляць і туфлі з чаравікамі.

Такім чынам, працам беларускіх археолагаў, прысвечаным вырабам з скуры сярэднявечнага перыяду, уласціва адносная агульнасць апісання і сістэматызацыі. Найбольш прадстаўленай у археалагічнай літаратуры катэгорыі знаходак з скуры з'яўляюцца розныя віды абутку, вызначэнне якіх не выклікае прынцыповых пытанняў. Разам з гэтым, у беларускай гістарыяграфіі па вывучаемаму пытанню адсутнічае адзіная класіфікацыйная схема скуранога абутку сярэднявечнага перыяду. Вырабам з скуры, акрамя абутку, нададзена значна менш увагі. Не разглядаецца інфармацыйны патэнцыял адыходаў гарбарна-шавецкай вытворчасці як асобнай групы археалагічнай калекцыі скуры. Выключна з мэтай структуравання апісання і сістэматызацыі матэрыялу, а таксама пазбягання розначытанняў, неабходна прыняць замацаваныя ў археалагічнай літаратуры вызначэнні асобных тыпаў вырабаў і адыходаў вытворчасці з улікам сучасных схем апісання і сістэматызацыі «археалагічнай скуры».

Пры вывучэнні матэрыялу выкарыстоўваюцца розныя падыходы. Разам з гэтым, адзінага варыянта на дадзены момант не існуе. Варта пагадзіцца з Д.А. Осіпавым аб немагчымасці прыняцця падыходзячай для ўсіх даследчыкаў і археалагічных калекцый методыкі апісання і графічнай фіксацыі матэрыялу [13, с. 177]. Гэта праяўляецца ў стварэнні навукоўцамі ўласных схем апісання і сістэматызацыі археалагічнага матэрыялу са скуры. Такімі прыкладамі з'яўляюцца працы М. Мілеўскай [8], О. Губітца [6], А.В. Курбатава [5], Д.А. Осіпава [4, с. 23-38], А. Кавальскай [7], А. Пушкорыуса [9].

На сённяшні дзень сярод апрабаваных і неабходных для выкарыстання на беларускім матэрыяле вылучаюцца прыклады апрацоўкі археалагічных калекцый скуры А.В. Курбатавым, Д.А. Осіпавым, А. Кавальскай, якія створаны з улікам вопыту папярэдніх даследаванняў.

Для прац, прысвечаных археалагічным калекцыям скуры, як правіла ўласцівы наступны падзел матэрыялу. Асобна вылучаецца абутак, да другой групы знаходак адносяць іншыя скураныя вырабы і апошняй катэгорыяй знаходак з'яўляюцца адыходы вытворчасці. Характэрнай рысай археалагічнага вывучэння гарбарна-шавецкага рамяства на сучасным этапе стала ўвага да апошняй з адзначаных груп матэрыялу.

А. Кавальскай быў прапанаваны прыклад сістэматызацыі археалагічных калекцый скуры, які грунтуецца на колькасці знаходак, стане іх захаванасці, разнастайнасці

PolotskSU



асартыменту вырабаў і накіраваны на статыстычна-фармальнае вывучэнне матэрыялу. Абгрунтаваным выглядае вылучэнне такіх груп як цэлыя (гатовыя) вырабы, элементы вырабаў, фрагменты вырабаў, адыходы вытворчасці. Істотным для фіксацыі дыягнастычных прыкмет на прадметах з’яўляецца стан іх захаваннасці, што непасрэдна ўплывае на інфармацыйны патэнцыял знаходкі. Гэта ўлічана А. Кавальскай пры падзеле фрагментаў і элементаў вырабаў на адрозныя аналітычныя групы [26, s. 26].

Асаблівая ўвага ў працы А. Кавальскай нададзена звароту да масавага і фрагментаванага археалагічнага матэрыялу з скуры. Адзначаецца магчымасць далейшага дапаўнення прыведзенай схемы. А. Кавальска прапаноўвае вылучаць «ścinki pierwotne», «ścinki wtórne» і «półfabrykaty» [7, s. 211; 26, s. 27]. У такім выпадку адбываецца падзел матэрыялу на дзве асноўныя групы – першасныя і другасныя адыходы, дзе вызначальнай рысай апошніх з’яўляецца паўторнага выкарыстанне прадмету. Група «półfabrykaty» уключае знаходкі, якія адлюстроўваюць пэўны этап вытворчасці вырабу [26, s. 27-28].

Неабходнасць вывучэння адыходаў вытворчасці адзначаецца таксама ў расійскай гістарыяграфіі [5, с. 131; 27]. У 1991 г. М.Ю. Палонскай была звернута ўвага на месцы канцэнтрацыі скураных абрэзкаў і вырабаў. Даследчыцай на матэрыялах са Смаленска вызначана велічыня нармальнай канцэнтрацыі знаходак са скуры на адзінку плошчы [27, с. 118]. Пазней даследаванні такога кшталту былі працягнуты А.В. Курбатавым [2, с. 82-83]. А.В. Курбатавым адзначаецца магчымасць вызначэння спецыялізацыі майстэрань, своеасаблівасці рамяства, складу, формы і дэкору вырабаў з скуры характэрных для кожнага рэгіёна і горада на аснове статыстычных дадзеных і планіграфічнага размеркавання адыходаў ад раскрою, абрэзкаў дэталей і цэлых вырабаў [2, с. 14].

А.В. Курбатавым вылучаюцца наступныя групы вытворчых адыходаў – першасныя і другасныя абрэзы [5, с. 136]. Як і ў працы А. Кавальскай А.В. Курбатавым сярод археалагічных калекцый вызначаецца групу знаходак, да якіх аднесены дэталі і фрагменты вырабаў (невытвотворчых адыходаў). Іх характэрнай рысай з’яўляецца адсутнасць слядоў абрэзу але наяўнасць зносу [2, с. 86].

У рэчышчы фармалізацыі апісання скуранога абутку была праведзена праца Д.А. Осіпавым (сумесна з А.Г. Ліхтэр). Д.А. Осіпаў адстойвае прынцып сістэмнага апісання, дзе вылучаюцца такія падсістэмы як марфалогія, тэхналогія і матэрыял. У сваю чаргу марфалогія прадстаўлена канструкцыяй і формай, колерам, памерам і дэкорам [4]. Даследчкам прапанаваны справачнікі класіфікатары, слоўнік і прыклады апісання, дзе вызначаецца набор канструкцыйных элементаў абутку, клас мадэлі абутку, від скуры, сляды тэхналагічных аперацый [4, с. 26, 102-109].

Аднак неабходна адзначыць, што адносіны да фармалізаванага апісання неадназначнае, што падкрэслівалася А.В. Курбатавым і самім Д.А. Осіпавым [13]. Так, А.В. Курбатавым вызначаны такі недахоп фармалізаванага апісання як вывучэнне артэфакта без гістарычнага кантэкста. Даследчык выказваецца за выключна музейнае выкарыстанне адзначанага тыпу апісання, для сістэматызацыі музейных калекцый [28, с. 249].

PolotskSU



Паводле А.В. Курбатава вывучэнне археалагічнай калекцыі скуры павінна адпавядаць комплекснаму падыходу, накіраванаму на атрыманне максімальна поўнай інфармацыі. Апісанне матэрыялу накіравана на выяўленне і фіксацыю марфалагічных тэхніка-тэхналагічных і іншых характарыстык [1, с. 26]. Методыка вывучэння археалагічнага матэрыялу са скуры А.В. Курбатава грунтуецца на працах А.І. Аяцевай. У 1973 г. быў апублікаваны яе артыкул «К методике изучения древней кожаной обуви» [10], у якім падсумаваны метадычны вопыт апрацоўкі археалагічных калекцый скуранога абутку з Пскова, Старой Ладагі, Белавозера. Па вызначэнні шэрагу навукоўцаў гэта стала якасна новым узроўнем вывучэння масавага археалагічнага матэрыялу [2, с. 35; 3, с. 58-59]. Выкананы её тэхналагічны аналіз і класіфікацыі скуранога абутку грунтаваліся на такіх прыкметах як матэрыял (сыравіна і тэхналогія яе апрацоўкі), канструкцыя (тэхналогія вытворчасці) і функцыянальная прыналежнасць [10, с. 105]. Паводле схемы А.І. Аяцевай вылучаюцца мяккі і цвёрды тыпы канструкцыі скуранога абутку. Для вывучэння розных формаў мяккага тыпу скуранога абутку былі вызначаны наступныя прыкметы: 1) метад мацавання (матэрыял для злучэння і характар швоў); 2) контуры наскоў і пятак суцэльнакроенай нарыхтоўкі, крой падэшвы і абрэз ніжняга края верху – для дэталёвакроеных; 3) месца размяшчэння шва нарыхтоўкі; 4) вышыня абутку; 5) контур абрэза верхняга краю; 6) сістэма мацавання да нагі; 7) прыёмы ўпрыгожання [10, с. 107]. Суцэльнакроеныя і дэталёвакроеныя нарыхтоўкі характарызуцца адпаведнымі параметрамі прыкмет [10, с. 107-109].

Алгарытм апісання археалагічнага матэрыялу са скуры, выкарыстаны А.В. Курбатавым пры вывучэнні калекцыі з Мангазеі ўключаў наступныя пазіцыі: 1) характарыстыка сыравіны і від апрацоўкі скуры; 2) варыянты раскроя; 3) разнавіднасць швоў; 4) форма і памеры вырабу ў сабраным выглядзе; 5) ступень зносу і сляды рамонту; 6) наяўнасць дэталей з другіх матэрыялаў; 7) наяўнасць і віды дэкору [1, с. 34]. Д.А. Осіпавым адзначана перавага методыкі А.В. Курбатава над фармалізаваным апісаннем з пункту гледжання інфарматыўнасці [13, с. 177].

У заходнееўрапейскай калектыўнай працы адзначана даследаванне «археалагінай скуры» вызначэннем і апісаннем наступных рыс: характар дублення; характэрныя асаблівасці на паверхні скуры, наяўнасць валасянога покрыва і вызначэнне відавой прыналежнасці скуры; швы, дэкаратыўныя элементы; колер; выкарыстоўваемые інструменты; ДНК аналіз [12, s. 254].

Асобна неабходна спыніцца на тыпалагічнай разнастайнасці вырабаў са скуры, тэрміналагічным прадстаўленні дэталей абутку і метадаў іх злучэння. Падыходзячай для археалагічных знаходак скуранога абутку з гарадоў Беларусі з'яўляецца канструкцыйна-тэхналагічная класіфікацыя, прапанаваная Д.А. Осіпавым. Даследчыкам была працягнута праца А.І. Аяцевай, створаная па старажытнарускаму абутку. Вылучаныя віды і тыпы абутку ў прапанаванай Д.А. Осіпавым схеме не маюць прынцыповых супярэчнаўнасцяў з наяўнымі ў беларускай гістарыяграфіі класіфікацыямі скуранога абутку і адпавядае выказаным С.В. Тарасавым заўвагам [25, с. 362]. Паводле класіфікацыі ўвесь абутак прадстаўлены двумя канструкцыямі – мяккай і цвёрдай. Кожная канструкцыя мае тыпы нізкага і высокага абутку. Крытэрыем для падзелу на падтыпы абутку мяккай канструкцыі

PolotskSU



вызначаны характар кроя – цэльнакроеныя і дэталёвакроеныя туфлі і боты. Поршні падзелены на простыя і састаўныя. Крытэрыем для падзелу на падтыпы абутку цвёрдай канструкцыі вызначана наяўнасць або адсутнасць абцаса [3, с. 61].

Да адзначанай класіфікацыі неабходна дадаць чаравікі мяккай канструкцыі, якія вядомы па выніках раскопак шэрагу беларускіх гарадоў [20; 21; 24; 29]. У абуўной вытворчасці і археалагічнай літаратуры да чаравікоў адносяць абутак, які закрывае нагу вышэй шчыкалаткі, а крытэрыем пры вызначэнні туфлей з'яўляецца пакрыццё нагі ніжэй шчыкалаткі [1, с. 41; 3, с. 152; 4, с. 41, 44]. Асобна неабходна адзначыць месца ў класіфікацыі туфляў XIII-XV ст. з Гродна [29, с. 65] і Мінска [21, с. 73, 77-78; 30, с. 174], канструкцыя якіх не мае цвёрдых заднікаў, абцасаў і г.д., але падэшвы могуць вызначацца цвёрдасцю і ўзмацняльнымі накладкамі-падмёткамі. Па меркаванні А.В. Курбатава такі абутак можна адносіць да пераходнага тыпу канструкцыі і называць яго цвёрдым умоўна [1, с. 41].

Пры апісанні і сістэматызацыі вырабаў з скуры, якія прызначаліся для захоўвання прадметаў неабходна выкарыстаць працу Т.С. Мацёхінай, дзе вылучаны наступныя функцыянальна-марфалагічныя групы: чахлы і футляры, кашалькі і сумкі. Вызначаны такія канструкцыйныя элементы вырабаў як тулава, вусце, сценка, дно, горла, карман, аддзяленне, клапан, крышка [31, с. 37]. Класіфікацыя вырабаў грунтуецца на іх прызначэнні, агульных асаблівасцях канструкцыі і формы, памерах, асаблівасцях тэхналогіі вытворчасці і дэкору [31, с. 36].

Спробу вырашыць пытанне тэрміналогіі датычнай археалагічных знаходак скуранога абутку ў беларускай гістарыяграфіі зрабіў С.В. Тарасаў, які, з прычыны немагчымасці дакладнага вызначэння адпаведнасці паміж узгадкамі назваў абутку ў пісьмовых крыніцах сярэднявечнага перыяду і наяўнымі археалагічнымі знаходкамі абутку, прапанаваў арыентавацца на сучасную тэрміналогію гарбарнай і шавецкай вытворчасці [25, с. 362; 30]. На расійскім археалагічным матэрыяле ў такім рэчышчы была праведзена праца Д.А. Осіпава, якая падаецца найбольш зручнай для вызначэння дэталей і дэкаратыўных элементаў скуранога абутку [4]. Метады злучэння дэталей неаднаразова разглядаліся ў працах А.В. Курбатава, Д.А. Осіпава і інш. [1; 2; 4; 5; 7; 9; 10].

Наступным пытаннем, якое патрабуе вырашэння гэта выкарыстанне правілаў абмеру, графічнага прадстаўлення археалагічнага матэрыялу са скуры і яго суаднясення з вербальным апісаннем. Адзначанае атрымала распрацоўку ў даследаваннях Д.А. Осіпава, А.В. Курбатава, А. Кавальскай, О. Губітца і інш. Правілы графічнай фіксацыі і правядзення абмераў прыведзены ва ўсіх асноўных археалагічных працах па гарбарна-шавецкаму рамяству [1, с. 27-31; 4, с. 58-88; 7; 9, s. 254]. Адпаведна ў межах артыкула мэтазгодна звярнуць увагу на праблемы графічнага прадстаўлення і абмеру матэрыялу са скуры з беларускіх гарадоў, што можа быць вырашана выкарыстаннем вышэйадзначаных прац. Прыведзеныя малюнкі ў выданнях беларускіх археолагаў пераважна не адлюстроўваюць тэхніка-тэхналагічныя асаблівасці вырабаў (канструкцыя злучэння верха і нізу абутку, тыпы швоў на вырабах, сляды рамонту і г.д.), а перадаюць формы крою вырабаў і асобных дэталей. Дадзеныя абмераў у працах беларускіх археолагаў выкананы пераважна па даўжыні і шырыні восей. Аднак не улічваюцца захват

PolotskSU



на швы, змена памераў археалагічнага матэрыялу са скуры падчас знаходжання без апрацоўкі і інш. Правядзенне абмераў ускладняе апісанне пры фіксацыі закругленняў, рознага плана неправільнай формы аб'ектаў. У такім выпадку неабходна выкарыстанне методык графічнай фіксацыі форм раскроя, канструкцыйна-тэхнічных і дэкаратыўных асаблівасцей археалагічнага матэрыялу са скуры [1, с. 27]. Адсутнічае вербальнае і графічнае прадстаўленне абрэзкаў ад раскрою, па характэрнай форме якіх можна рабіць вынікі аб раскрою канкрэтных дэталей вырабаў [1, с. 28].

Высновы. Такім чынам, вызначаюцца наступныя прабемы апісання і сістэматызацыі археалагічнага матэрыялу са скуры з гарадоў Беларусі: своечасовасць апісання, структураванне апісання і сістэматызацыя археалагічнага матэрыялу са скуры ў адпаведнасці з сучаснымі схемамі, інфарматыўнасць апісання знаходак (тэрміналогія апісання, правядзенне абмераў, графічнае прадстаўленне).

Апісанне археалагічнага матэрыялу са скуры неабходна праводзіць у кароткі тэрмін пасля знаходжання з мэтай пазбягання разбурэння і ўсыхання знаходак. Асабліва гэта актуальна пры адстутнасці вопыту працы з «археалагічнай скурай». У такім разе, акрамя прымянення рэкамендацый па палявой кансервацыі (А.В. Курбатаў, М. Група, Э. Кэмеран, Дж. Спрынгс, Б. Уілс), можыць быць выкарыстаны алгарытм апісання скураных прадметаў прапанаванага Д.А. Осіпавым. Прыведзены Д.А. Осіпавым варыянт апісання, слоўнік скуранога абутку зручны для вызначэння відаў абутку і яго асобных дэталей, тыпаў злучэнняў, дэкарывання і г.д. Аднак неабходна імкнуцца да комплекснага падыходу з мэтай максімальнага атрымання інфармацыі аб вывучаемым прадмеце (А.В. Курбатаў).

У рэчышчы структуравання апісання інтарэс выклікае стварэнне камп'ютэрных баз дадзеных, якія дазваляюць аблегчыць і захаваць апісанне знаходак. У далейшым стандартызаваны запіс аб артэфактах можа быць выкарыстаны пры сістэматызацыі музейных калекцый. Тэрміналагічнае прадстаўленне археалагічных знаходак са скуры павінна ўлічваць розніцу паміж сучаснай тэрміналогіяй гарбарнай і шавецкай вытворчасці, а таксама тэрміналогіяй, якая замацавалася ў гістарыяграфіі па вывучаемаму пытанню. Апошняй аддаецца перавага, але пры неабходнасці канкрэтызацыі вызначэнні прадметаў або яго канструкцыйных элементаў могуць быць выкарыстаны тэхнічныя стандарты.

Структура апісання археалагічнага матэрыялу са скуры павінна ўлічваць стан захавання матэрыялу, што вызначае падзел археалагічнай калекцыі на асобныя групы для аналізу (цэлыя вырабы, элементы вырабаў, фрагменты вырабаў, адыходы вытворчасці). Падзел археалагічнай калекцыі на групы абумоўлены іх розным інфармацыйным патэнцыялам і неабходнасці статыстычнай апрацоўкі. Аналіз павінен уключаць прыкметы матэрыялу (сыравіны і сляды яе апрацоўкі), канструкцыю/марфалогію (вызначэнне рэчы, раскрой, швы, форма, наяўнасць і віды дэкору) і «эксплуатацыйныя» сляды (сляды зносу і рамонту, полаўзроставая, этнічная і сацыяльная прыналежнасць).

Графічнае прадстаўленне археалагічнага матэрыялу са скуры і правядзенне іх абмераў распрацаваны у расійскіх, польскіх і заходнееўрапейскіх даследаваннях.

PolotskSU



Вызначаюцца дзве асноўныя мадэлі графічнага прадстаўлення: А.В. Курбатава і О. Губіца (дапоўненная А. Пушкорыўсам). Абранне канкрэтнай мадэлі графічнага прадстаўлення для археалагічнага матэрыялу са скуры з гарадоў Беларусі, улічваючы адсутнасць адзінай, не з'яўляецца прынцыповым. Перадача тэхніка-тэхналагічных асаблівасцей знаходак, форм раскрою вырабаў і асобных дэталей, швоў і злучэнняў, дэкору павінна адпавядаць адной з асноўных задач вывучэння археалагічнага матэрыялу са скуры – захаванне і прадстаўленне інфармацыйнага патэнцыялу знаходкі, чаму адпавядаюць абедзве адзначаныя мадэлі. Правілы абмеру археалагічных знаходак са скуры прадстаўлены ў працах А.В. Курбатава, Д.А. Осіпава, А.Кавальскай і інш. Яны з'яўляюцца апрабаванымі і неабходнымі для выкарыстання на беларускім археалагічным матэрыяле са скуры.

ЛІТАРАТУРА

1. Визгалов, Г.П. Мангазея: кожаные изделия (материалы 2001–2007 гг.) / Г.П. Визгалов, С.Г. Пархимович, А.В. Курбатов. – Нефтеюганск ; Екатеринбург : АМБ, 2011. – 216 с.
2. Курбатов, А.В. Кожевенное ремесло в средневековой России : дис. ... д-ра ист. наук : 07.00.06 / А.В. Курбатов. – СПб., 2012. – 622 л.
3. Осипов, Д.О. Кожевенно-сапожное ремесло Великого Новгорода X-XVII вв. (комплексное исследование) : дис. ... доктора ист. наук : 07.00.06 / Д.О. Осипов. – М., 2012. – 395 л.
4. Осипов, Д.О. Обувь московской земли XII-XVIII вв. / Д.О. Осипов // Материалы охранных археологических исследований. – Т. 7. – М. : ИА РАН, 2006. – 202 с. : ил.
5. Курбатов, А.В. Методические аспекты историко-археологического анализа средневекового кожевенного производства / А.В. Курбатов // Проблемы хронологии и периодизации в археологии. Археологические изыскания. – Ленинград. – 1991. – Вып. 3. – С. 130–140.
6. Goubitz, O. The Drawing and Registration of Archaeological Footwear / O. Goubitz // Studies in Conservation.– 1984. – Vol. 29. – N 4. – P. 187–196.
7. Kowalska, A.B. Archeologia o średniowiecznym skórnictwie na ziemiach polskich. Zarys problematyki / A.B. Kowalska // Studia nad średniowiecznym skórnictwem. – Szczecin, 2009. – S. 193-247.
8. Milewska, M. A metod of rekording late medieval footwear fids / M. Milevska // Archeologia Polona, 1980. – XIX. – S. 115–136.
9. Puskorius, A. Senojo odinio apavo terminija / A. Puskorius // Lietuvos archeologija. – 2007. – T.30. – P. 229-256.
10. Оятева, Е.И. К методике изучения древней кожаной обуви / Е.И. Оятева // Археологический сборник Государственного Эрмитажа. – Ленинград, 1973. – Вып. 15. – С. 105–111.
11. Grupa, M. Suche czy mokre, problematyka konserwatorska na stanowiskach archeologicznych w kontekście badań na Reducie Ordona / M. Grupa // Warszawskie Materiały Archeologiczne. – T. 1. – Warszawa, 2014. – S. 125-136.

PolotskSU



12. Marion, K. Conservation of leather and related materials / K. Marion, R. Thomson. – London, 2006. – 340 s.
13. Осипов, Д.О. [Рецензия] / Д.О. Осипов // Российская археология. – 2013. – № 2. – С. 176-179. – Рецензия на книгу: Мангазея. Кожаные изделия (Материалы 2001-2007 гг.) – Екатеринбург, 2011. – 215 с.
14. Изюмова, С.А. К истории кожевенного и сапожного ремесел Новгорода Великого / С.А. Изюмава // Материалы и исследования по археологии СССР. – Москва, 1959. – № 65 – С. 192–222.
15. Изюмова, С.А. По поводу рецензии Ю.П. Зыбина / С.А. Изюмава // Советская археология ; редкол.: А.В. Арциховский [и др.]. – № 2. – 1965. – С. 286.
16. Оятева, Е.И. Белозерская кожаная обувь / Е.И. Оятева // Весь и славяне на Белом озере X–XIII вв. / Л.А. Голубева. – Москва, 1973 – С. 199–205.
17. Оятева, Е.И. Обувь и другие кожаные изделия Земляного городища Старой Ладоги / Е.И. Оятева // Археологический сборник Государственного Эрмитажа. – Ленинград, 1965. – Вып. 7. – С. 42–59.
18. Оятева, Е.И. Обувь и другие кожаные изделия древнего Пскова / Е.И. Оятева // Археологический сборник Государственного Эрмитажа. – Ленинград, 1962. – Вып. 4. – С. 77–94.
19. Зыбин, Ю.П. [Рецензия] / Ю.П. Зыбин // Советская археология. – 1965. - № 2. – С. 284-286. – Рецензия на статью: Изюмова, С.А. К истории кожевенного и сапожного ремёсел / С.А. Изюмава // Материалы и исследования по археологии СССР. – 1959. – № 65 – С. 192–222.
20. Штыхаў, Г.В. Шавецкае рамяство старажытнага Полацка / Г.В. Штыхаў // Весці Акадэміі навук БССР. Серыя грамадскіх навук. – 1962. – №3. – С. 81-90.
21. Шут, К.П. Обувь древнего Минска (по по археологическим данным) / К.П. Шут // Материалы IX конференции молодых ученых / под общей ред. Т.С. Горбунова. – Минск, 1965. – С. 72-81.
22. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк (IX-XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1975. – 136 с.
23. Ляўко, В.М. Абутак з культурнага слоя Віцебска XIV-XVIII стст. / В.М. Ляўко // Помнікі старажытнабеларускай культуры: новыя адкрыцці / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. С.В. Марцэлеў. – 1984. – С. 168-174.
24. Бубенько, Т.С. Кожаная обувь средневекового Витебска XII–XVIII вв. (по материалам исследований Нижнего замка) / Т.С. Бубенько // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі. Новыя матэрыялы і даследаванні. – Мінск, 1993. – С. 127–137.
25. Тарасаў, С.В. Гарбарства і скураныя вырабы / С.В. Тарасаў // Археалогія Беларусі : у 4 т. / пад рэд.: В.М. Ляўко [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 4 : Помнікі XIV – XVIII стст. – С. 356–365.
26. Kowalska, A Wytwórczość skórzana we wczesnośredniowiecznym Szczecinie / A. Kowalska. – Szczecin, 2010. – 310 s.
27. Полонская, М.Ю. Кожаная обувь древнего Смоленска / М.Ю. Полонская // Смоленск и Гнездово (К истории древнерусского города). – Москва, 1991 – С. 105–124.

PolotskSU



28. Курбатов, А.В. Музееведение и археология – две составляющих в изучении древнерусской моды и кожевенного ремесла [Рецензия] / А.В. Курбатов // Археологические вести. – 2008. - № 15. – С. 246–254. – Рецензия на книгу: Осипов, Д.О. Обувь московской земли XII–XVIII вв. / Д.О. Осипов // Материалы охранных археологических исследований. – Т. 7. – Москва : ИА РАН, 2006. – 200 с.
29. Трусаў, А.А. Стары Замак у Гродне XI-XVIII стст. / А.А.Трусаў, В.Е. Соболь, Н.І. Здановіч. – Мінск, 1993. – 152 с.
30. Тарасов, С.В. Технология и инструменты кожевенно-сапожного ремесла Полоцка и Минска (XI–XVIII вв.) / С.В. Тарасов // Памятники науки и техники 1987–1988 гг. – Минск, 1989. – С. 164–175.
31. Матехина, Т.С. Кожаные изделия средневекового Новгорода: чехлы, футляры, сумки : дис. … канд. ист. наук / Т.С. Матехина. – Москва, 2009. – 204 л.

## THE PROBLEMS OF ARRAGEMENT AND DESCRIPTION OF ARCHAEOLOGICAL FINDS FROM LEATHER IN BELARUS

*I. KAMINSKI*

*This article attempts to define problems of arrangement and description of archaeological finds obtained in the course of excavation research in Belarus for more than half a century. Relatively rarely are leather objects obtained in the course of archaeological excavation studies subject to complex analyses taking into account comprehensive sources, including production waste and fragments of products which are functionally unidentified. Usually best preserved or unique objects (assemblages) from particular excavation digs have been presented. The following constraints have been identified: drawing and technical information records before treatment, ensure the compliance of the arrangement and description of archaeological finds made from leather in Belarus and modern examples of studies, attention to research capacity of the leather collection. Their solutions have been identified.*

*Keywords*: *Belarus, leather, archaeological finds, arrangement and description.*